УДК 37.013:7.01

# Тэарэтычныя асновы традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы (канец XIX – пачатак XX стагоддзя)

**С.Р. Туболец**
*Установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава»*

Репозиторий ВГУ

Некантралюемае пашырэнне урбанізацыі сучаснага грамадства вядзе да страты агульначалавечых каштоўнасцей, што сфарміраваны на працягу стагоддзяў. Таму прагрэсіўная міравая суполка, нягледзячы на працэсы глабалізацыі, акцэнтуе ўвагу на эстэтыцы жыцця, эстэтычным выхаванні, адраджэнні традыцыйнага эстэтычнага выхавання. Аднак у агульным культурным

***Адрес для корреспонденции:*** 210032, г. Витебск, ул. Чкалова, 30, кв. 237, e-mail: svetla237@rambler.ru – Туболец С.Г.

асяроддзі прыярытэты належаць усё ж масаваму мастацтву з яго арыентацыяй на сярэднестатыстычную асобу.

Наша краіна мае шэраг законаў, праграм, канцэпцый [1–3], што пабудаваны на этнакультурным падмурку, арыентаваны на выкарыстанне мясцовых умоў, традыцый, выхаваўчых магчымасцей. Яны ўдзяляюць значную ўвагу менавіта эстэтычнаму выхаванню на народнай педагагічнай аснове. Сістэма адукацыі шукае новыя шляхі работы, каб сфарміраваць у асобе разуменне самой сябе, сваёй ролі ў жыцці грамадства, у далучэнні да свайго этнасу. У той жа час не прадбачыцца цэласнай сістэмы эстэтычнага выхавання, заснаванай на этнакультурных традыцыях народа, што абумоўлена адсутнасцю грунтоўнага тэарэтыка-метадалагічнага падыходу да вывучэння традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы.

Усвядомлена неабходнасць выкарыстання станоўчых традыцый беларускай народнай педагогікі ў тэорыі і практыцы выхавання, у тым ліку эстэтычнага. Гэта свядомасць грунтуецца на разуменні таго, што традыцыі беларускай народнай педагогікі маюць станоўчы патэнцыял, які спрыяе раскрыццю чалавечых здольнасцей. Між тым адсутнасць дастатковых навуковых даследаванняў па адзначанай праблеме, нераспрацаванасць шляхоў яе рэалізацыі перашкаджаюць увасабленню ў жыццё народнай мудрасці. Фактычна патэнцыял беларускай народнай педагогікі застаецца малазапатрабаваным.

Такім чынам, існаванне шэрага супрацьлегласцей акцэнтуе, праецыруе ўвагу на суадносіны этнічнага і эстэтычнага выхавання, на сувязь традыцыйнай народнай педагогікі і эстэтычнага выхавання. Аднак, адсутнічае цэласнае бачанне тых патэнцыяльных магчымасцей, якімі традыцыйна валодаў народ у галіне эстэтычнага выхавання. Усё гэта патрабуе звароту да традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы, бо толькі сістэматызацыя ведаў у дадзенай галіне, абагуленыя, цэласныя веды аб духоўным багацці, што захавана продкамі, дае магчымасць паспяхова рэалізаваць назапашаны народны вопыт у сучаснай дзейнасці.

Мэта даследавання: вылучыць тэарэтычныя асновы традыцый эстэтычнага выхаваня ў народнай педагогіцы і раскрыць сутнасць традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы (канец XIX – пачатку XX стагоддзя) праз класіфікацыю метадаў эстэтычнага выхавання.

**Матэрыял і метады.** Аб'ект даследавання: беларуская народная педагогіка. Прадмет даследавання: традыцыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы канца XIX – пачатку XX стагоддзя (што абумоўлена найбольшай распаўсюджанасцю ў дадзены перыяд традыцый беларускай педагогікі ў жыцці беларускага сялянства). Даследаванне выканана з выкарыстаннем комплексу ўзаемадапаўняльных метадаў: апісальна-аналітычнага, параўнальна-гістарычнага, а таксама гісторыка-педагагічнага аналізу, навукова-даследчых прыёмаў (інтэрпрэтацыя, супастаўленне, сістэматызацыя і класіфікацыя).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** З моманту выхаду ў свет працы Г.С. Вінаградава «Народная педагогіка» цікавасць да азначанага накірунку не памяншаецца. Да вырашэння пытанняў народнай педагогікі звяртаецца шэраг даследчыкаў як Расіі (А.Ф. Хінтыбідзе, Ш.А. Мірзоеў, З.П. Васільцова, Г.Н. Волкаў), так і Беларусі (Г.П. Арлова, В.С. Болбас, А.Э. Крываносава, А.Дз. Міхайлава). Мы разглядаем народную педагогіку як абагуленую сістэму выхавання, што складзена ў межах пэўнага этнасу, абапіраецца на асаблівасці канкрэтнай народнай культуры, светаўспрыняцця, традыцыйнага ўзаемадзеяння з наваколлем і мае мэтай фарміраванне дасканалай асобы, чые ідэальныя характарыстыкі адбіты ў фальклоры. Народная педагогіка – выток багацця сучаснай культуры і яе дасягненняў.

Репозиторий ВГУ

Вядома, што прыгажосці належыць галоўная роля ў працэсе фарміравання ўнутранага свету асобы. Прадстаўнікі навукі падкрэсліваюць неабходнасць пераасэнсавання ролі чалавека, здзяйснення свайго роду культурнай рэвалюцыі, у выніку якой адбудзецца паляпшэнне духоўных і разумовых здольнасцей людзей. Менавіта эстэтычная адукацыя садзейнічае пераходу ад педагогікі ведаў, уменняў, навыкаў да педагогікі развіцця, фарміравання духоўных асноў моладзі. Адным з рэальных накірункаў з'яўляецца засваенне і творчае выкарыстанне народных традыцый, забеспячэнне пераемнасці ў развіцці айчыннай культуры.

Традыцыі, згодна з філасофскім разуменнем (Э.С. Маркаран, Ю. Лявада, А.В. Мудрык, А.Б. Гофман), – спосаб захавання і передачы, аднаўлення сацыяльных інстытутаў і норм, пры якім падтрымка апошніх абапіраецца на іх існаванне ў мінулым. У сваю чаргу, мы бачым сутнасць дэфініцыі ў наступным. Традыцыі – гэта сістэма перадачы сацыяльна значымых ведаў, каштоўнасцей, поглядаў, навыкаў, што гістарычна склаліся на працягу стагоддзяў пад уплывам нацыянальнай культуры і накіраваны на захаванне і памнажэнне дадзенага народнага вопыту. Мы падтрымліваем Г.Н. Волкава ў яго разважаннях пра тое, што апора на свае адвечныя народныя, нацыянальныя традыцыі вядзе да дэмакратычнасці сістэмы адукацыі і выхавання [4].

Так, сёння ў этнапедагагічных працах яскрава прасочваецца ідэя аб актуальнасці ўвядзення традыцый народнай педагогікі ў практыку выхавання падрастаючага пакалення, выказваюцца ідэі аб неабходнасці вывучэння, пераасэнсавання народных традыцый і рэалізацыі іх у педагагічнай практыцы, важнасці пераемнасці навуковай і народнай педагогікі. Аднак недастаткова спецыяльных этнапедагагічных даследаванняў, што разглядаюць асаблівасці ўздзеяння народнай педагогікі народаў і народнасцей на членаў этнасу.

Распрацоўку тэарэтычных асноў выхавання ў беларускай народнай педагогіцы мы лічым магчымай перш-наперш праз раскрыццё ўяўленняў аб сутнасці традыцый эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы ўвогуле.

На аснове вывучэння этнапедагагічных, гістарычных, педагагічных прац мы прыйшлі да высновы, што эстэтычнае выхаванне ў народнай педагогіцы – выхаванне ў асобе жадання, здольнасці ўспрыняцця і разумення таго прыгожага ў жыцці, якое з'яўляецца жыццёва неабходным; фарміраванне на гэтай глебе эстэтычных густаў, эмацыянальных адносін да акаляючага свету і сацыяльнага жыцця праз авалоданне культурай продкаў. Эстэтычнае выхаванне ў народнай педагогіцы – працэс, які ахоплівае ўсе ўзроставыя групы, характарызуецца працягласцю (ад нараджэння дзіцяці на працягу ўсяго жыцця), мэтанакіраванасцю (фарміраванне эстэтычна дасканалай асобы), бесперапыннасцю (выхоўваюць людзі, прыродная рэчаіснасць, побыт, як у працоўнай дзейнасці, так і ў вольны час). Традыцыі эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы – гістарычна аформленая на працягу стагоддзяў сістэма перадачы эстэтычных ведаў, каштоўнасцей, поглядаў, густаў народа ў працэсе выхаваўчага ўзаемадзеяння пакаленняў.

Вылучым асноўныя прынцыпы даследавання традыцый эстэтычнага выхавання, што спраецыраваны на сферу беларускай народнай педагогікі і вызначаюць сутнасць традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы. Мы лічым неабходным засяродзіць увагу на наступных прынцыпах, што вылучаюцца з аналізу шэрага педагагічных, этнапедагагічных, культуралагічных даследаванняў:

– адзінства жыцця і выхавання (выхаванне ў жыцці і праз жыццё);

– цэласнасці выхаваўчага працэсу, непарыўнасці і ўзаемадапаўняльнасці выхаваўчых уздзеянняў (падзел выхавання на аспекты даволі ўмоўны, бо кожны накірунак мае цесныя сувязі з усімі іншымі);



Репозиторий ВГУ

– народнасці (у аснове выхавання – родная культура, мова і народная творчасць);

– натуральнасці выхаваўчых падыходаў народа (натуральнасць – універсальная асаблівасць і сродак народнага выхавання);

– культураадпаведнасці (апора на айчынныя ідэі творчага самаразвіцця); прынцып прыродаадпаведнасці (выхаванне ў строгай адпаведнасці з узроставай перыядызацыяй, якая адбывалася ў адпаведнасці з порамі года);

– прыярытэту народнай педагогікі ў выхаванні (выхаванне пачынаецца ў сямейным побыце, дзе пануюць народныя выхаваўчыя традыцыі);

– уліку асаблівасцей нацыянальнай культуры ў выхаванні (народныя традыцыі і асаблівасці выхавання далучаюць асобу да пэўнага этнасу).

Выяўляючы ўмовы рэалізацыі эстэтычнага выхавання на аснове аналізу этнаграфічных, этнапедагагічных крыніц, мы лічым, што асноўнымі з іх выступаюць: прыроднае ўздзеянне, выхаванне ў працы, выкарыстанне патэнцыялу народнай творчасці, распаўсюджванне ў паўсядзённым жыцці беларускага селяніна трыяды: мары, народныя вераванні, успаміны (інтэнсіфікатары народнага духоўнага жыцця).

Для больш выразнага раскрыцця традыцый эстэтычнага выхавання неабходна звярнуцца да раскрыцця перадумоў фарміраваннння эстэтычнага ідэалу ў беларускай педагогіцы, даць яго характарыстыку.

На фарміраванне эстэтычнага ідэалу значны ўплыў аказалі аб’ектыўныя (геаграфічныя (як асаблівасці прыродна-кліматычнай зоны з бесперапыннымі выразнымі сезоннымі зменамі), біялагічныя (існаванне пэўнага тыповага вонкавага выгляду чалавека, які прыстасаваны для тыповага прыроднага асяроддзя), класавыя (у беларускай народнай педагогіцы замацаваны эстэтычны ідэал сялянства – чалавека, здольнага да працы, працаўніка, які эстэтычна пераўтварае і ўпрыгожвае жыццё) і суб’ектыўныя – нацыянальныя (выхаванне з пазіцый талерантных адносін да іншых нацыянальнасцей), рэлігійныя (бесканфліктнае суіснаванне ў адных межах некалькіх канфесій, якія не толькі не супрацьпастаўляліся, але і пашыралі дыяпазон прымальнасці эстэтычных з’яў), працоўныя (прыгожае тое, што мае утылітарна-практычны сэнс, што дапамагае чалавеку), маральныя (аб’яднанасць прыгожага і маральнага), міжнацыянальныя (уплыў эстэтычных ідэалаў іншых народаў) перадумовы.

Для эстэтычнага ідэалу беларускага народа ўласцівы наступныя характарыстыкі: дынамізм (існаванне шматварыянтнасці адной з’явы – казак, загадак, песень, узораў адзення, спосабаў упрыгожвання рэчаў), дэмакратызм (кожны чалавек валодае майстэрствам, можа праявіць яго ў працоўнай або ў мастацкай дзейнасці), кансерватызм (вельмі маруднае з’яўленне ці знікненне фальклорных формаў, формаў мастацкай выразнасці, якія трансфармуюцца, набываюць іншы сэнс, характар, але застаюцца ў народным жыцці), якія дазваляюць кожнаму чалавеку тварыць прыгажосць суадносна з уласным яе бачаннем, але ў агульным нацыянальным накірунку. Пры гэтым замацаванню належаць найлепшыя ўзоры, свайго роду эстэтычныя эталоны.

Грунтоўнае вывучэнне традыцый эстэтычнага выхавання дазволіла нам раскрыць змест эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы праз сістэму метадаў, якія рэалізуюцца традыцыйнымі сродкамі.

Найбольш адпаведнымі сродкамі эстэтычнага выхавання мы вылучаем працу, рамёствы, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, мову, вусную народную творчасць, гульні, песні, прыкметы, традыцыі, звычаі, святы, абрады, эстэтыку паводзін, быта, арганізацыю асяроддзя, у якім знаходзіцца чалавек, прыроду.

Метады эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы патрабуюць разгляду згодна з іх накіраванасцю на ўнутраны свет асобы (інтравер-

Рэпазіторый ВДУ

таваныя) альбо накіраванасцю асобы на знешні духоўны ці матэрыяльны свет (экстравертаваныя). Яны рэалізуюцца праз сям'ю, мясцовую суполку жыхароў, калектыў аднагодкаў і ў працэсе самавыхавання.

Першая група метадаў – інтравертаваных – спрыяе далучэнню асобы да свету прыгажосці: фарміраванне і развіццё ўмення бачыць, адчуваць, успрымаць, разумець, ацэньваць прыгожае, эстэтычна перажываць з'явы прыгажосці (непрыгажосці). Рэалізацыя ідзе праз такія метады, як перакананне, праца, прыклад і аўтарытэт, назіранне, прывучанне, унушэнне, гутарка, тлумачэнне, заахвочванне, запалохванне, ухваленне, вымова, зварот да эстэтычных пачуццяў, павага да старэйшых, грамадская думка, асуджэнне, ухваленне, прыклад і аўтарытэт, распавед, узаемная павага, гульня, практыкаванне, выкарыстанне звароту да пачуццяў страху, брузглівасці, саманазіранне і г.д.

Важнай рысай метадаў эстэтычнага выхавання з'яўляецца спецыфіка іх прымянення ў розных сацыяльных падгрупах. Па-першае, у галоўным сацыяльным інстытуце, у межах якога праходзіла і праходзіць выхаванне дзіцяці – сям'і (гэта першасны інстытут сацыялізацыі асобы, група родзічаў, што жыве разам, вядзе гаспадарку і выконвае функцыі нараджэння і выхавання дзяцей). Ад сям'і, ад бацькі з маткай усё добрае і ўсё благое: «Якое дрэва – такі і клін, які бацька – такі і сын; якая дошка – такая і стружка, якая маці – такая і дачушка», «Якое карэнне, такое і насенне» [5]. Другая сацыяльная падгрупа – мясцовая суполка жыхароў (як сукупнасць жыхароў, што аб'яднаныя формамі сумеснага жыцця і дзейнасці ў пэўных тэрытарыяльных межах). Трэцяя – асяроддзе равеснікаў, чые погляды, паводзіны, выхаванасць таксама ўплывалі на працэс выхавання, у нашым выпадку эстэтычнага. І, нарэшце, чацвёрты кампанент, які прысутнічае пры выкананні любой дзейнасці, – сама асоба, яе рэагаванне на ўласныя ўчынкі і на ўздзеянне з іншых бакоў.

Існаванне чалавека ў коле суседзяў, землякоў актуалізавала уплыў мясцовай суполкі жыхароў на працэс выхавання. Гэта актыўная сіла, якая кантралявала сфарміраванасць у людзей эстэтычных якасцей, унутраных запатрабаванняў весці сябе згодна з эстэтычным ідэалам без прымусу. Суполка выносіць рашэнне, заахвочвае і асуджае, ухваляе і ганьбіць. Кожная сям'я ўлічвала ўплыў грамадскай думкі, прымала пад увагу пазіцыю сваякоў, суседзяў, наогул, сацыяльнага асяроддзя. «Грамада – вялікі чалавек» [5]. Этнапедагог Г.П. Арлова адзначае: «Нярэдка, ацэньваючы тую ці іншую з'яву ў жыцці чалавека, народ бярэ гатовыя, універсальныя па змесце і форме характарыстыкі (выслоўі, прыказкі, прымаўкі, афарызмы). Гэта, дарэчы, дазволіла выдзеліць вусную народную творчасць у своеасаблівы інструмент рэгуляцыі паводзін чалавека. Чалавек "узгадняе" свае паводзіны з адпаведнай грамадскай думкай» [6].

У народнай практыцы выхавання дзіця абавязкова існавала і ў грамадстве равеснікаў. Гэта давала магчымасць выпрацоўваць свае, групавыя ўзаемаадносіны, падзяляліся інтарэсы, схільнасці, магчымасці, чалавек знаходзіў сваё месца сярод роўных. Сярод дзяцей вылучаліся пэўны хлопец ці дзяўчына, больш спрытныя, моцныя, лоўкія, прыгожыя, якія мелі больш ведаў ці навыкаў. Менавіта гэты чалавек станавіўся лідэрам, ва ўсялякім выпадку прэтэндаваў на гэтую ролю. Характэрны звычай: калі хто-небудзь з хлопцаў рабіў нешта нядобрае, то маглі кінуць у бруд ягоную шапку. Лічылася нядобрым рабіць фізічнае пакаранне, а праз рэч выказваліся адносіны да ўчынку чалавека альбо да самой асобы.

У беларускай народнай педагогіцы актыўна прапагандуецца працэс самавыхавання. Ён вызначальны для значнасці асобы і яе дзейнасці ў грамадстве. Пра значнасць самаўдасканалення ў межах эстэтычнага выхавання гавораць казкі, калі знешне і сацыяльна невыразны галоўны герой, што прайшоў шэраг

Рэпазіторый ВДУ

выпрабаванняў, даказаў свае высокія чалавечыя якасці, пераўтвараецца ў добра-молайца, бярэ шлюб з прыгажуняй, з царэўнай – атрымоўвае эстэтычна ўзвышаную прывабную ўзнагароду.

Праз саманазіранне і самааналіз чалавек вучыцца знаходзіць тое ў навакольным і грамадскім жыцці, што кранае яго душу, вабіць вонкава ці гукам. Самааналіз праходзіць праз усю сістэму прыказак і прымавак («Без прыказкі размова, што ежа без солі», «Без прыказкі і з лаўкі не зваліцца», «У прыказцы – праўда святая», «Добрая прыказка не ў брыво, а ў вока» [5]). Шляхам паўсячаснага ўжывання прыказак і прымавак, дзе замацаваны маральна-этычны кодэкс народа, чалавек аналізуе жыццё, свае ўчынкі, а гэта значыць, узгадняе паводзіны, дзеі з ідэаламі: «Сон на заўтра адлажы, а справу сёння зрабі», «Лепей жартаваць, чым гараваць». Распаўсюджана самаўнушэнне. Беларус верыў, што, калі нейкія справы будуць выконвацца ў традыцыйным строга зафіксаваным парадку, то гэта паспрыяе як урадлівасці глебы, моцнасці жывёлы, так і заможнасці гаспадаркі, інакш кажучы – дабрабыту. Дабрабыт разглядаўся як неад’емная частка эстэтычнага ідэалу, да якога мелі намер наблізіцца: «…Дай жа, Божа, пане гаспадару, // Жыці-быці, жыта павазіці, // Жыта павазіці, у тару злажыці, // У тару прыкладна, на таку ўмалотна, // На таку ўмалотна, у арудзе прысыпна…» [7].

Другая група метадаў – экстравертаваных – скіравана на фарміраванне і развіццё ўменняў ствараць і захоўваць прыгажосць паводзін, зносін, працы, творчасці, прыроды і г.д. Мы звяртаем увагу на наступныя метады: практыкаванні, ухваленні, праца, вымова, прывучэнне, іспыт, спаборніцтва, грамадская думка, сумеснае правядзенне вольнага часу, гульні, пастаноўка далейшай перспектывы, супарадкі, вячоркі і г.д.

Пры змене сацыяльнага статусу чалавек павінен быў карэктаваць уласны вонкавы выгляд – трансфарміраваць адзенне. Такім чынам дзяўчына плануе, рыхтуе сабе пэўныя элементы адзення, якія ўваходзяць у гардэроб пасля ўступлення ў шлюб. Майстрыца задумвае рэч і выконвае ўсе працоўныя аперацыі. Навогул жа, працоўныя спаборніцтвы нават не трэба аб’яўляць, бо вядома, што 25 лютага выстаўляецца на мароз пража, а 2 красавіка, на Святлану, выносяцца на вуліцу ільняныя палотны. І кожная асоба жадае, каб яе вырабы былі названы лепшымі. Па традыцыі моладзь вырабляе прыгожыя, неабходныя ў гаспадарцы рэчы і падносіць іх у падарунак каханым, сябрам, родным. Грамадская думка ацэньвае намаганні маладых, адзначае і ўхваляе тых, хто жыве і нясе прыгажосць, умее працаваць і адпачываць. Гэтая асаблівасць яскрава праяўляецца ў час супарадак і пасядзелак, калі яднаюцца рукадзелле, спевы, гутаркі, гульні, а ўдзельнікі імкнуцца быць найбольш прывабнымі: прыгажэйшымі, спрытнейшымі, працавітымі.

Існаванне ў плыні роднай мовы, актыўнае карыстанне яе багаццямі вядзе да таго, што кожны чалавек можа стаць аўтарам ці сааўтарам твора. Авалоданне сістэмай паэтычна-вобразнай сімволікі, асаблівасцямі песнятворчасці, вершаскладання – спачатку служыць развіццю эстэтычнага густу, а потым арганізуе эстэтычна значныя практычныя дзеянні.

Кожны член вясковай суполкі паводзіць сябе такім чынам, каб прыемна было і яму, і яго суседзям. Жыхары вёскі віталіся і з незнаёмымі. Можна казаць пра традыцыйную эстэтыку быту, бо рэчы хатняга ўжытку змяшчаліся ў пэўнай паслядоўнасці і парадку, які адзначаўся, ухваляўся вяскоўцамі. Народ разумее, што эстэтычна выхоўвае не проста прыгожае наваколле, а самі людзі, іх праца, бо яны вучаць не толькі заўважаць і любіць прыгожае, але і актыўна клапаціцца пра яго. Праз народную педагогіку праходзіць думка, што выхавальнік павінен ведаць, што з’яўляецца прыгожым; што ўяўляе сабой эстэтычны ідэал і

Рэпазіторый ВДУ

шляхі набліжэння да яго; ён сам, учынкі, быт павінны быць эстэтычнымі, інакш кажучы, аб'ядноўваюцца імкненні, словы і справы чалавека.

**Заключэнне.** Тэарэтычныя асновы праблемы традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы трэба разглядаць праз:

– сутнасць традыцый эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы ўвогуле;

– прынцыпы даследавання традыцый эстэтычнага выхавання, што спраецыраваны на сферу беларускай народнай педагогікі;

– умовы рэалізацыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы;

– перадумовы фарміравання эстэтычнага ідэалу;

– змест эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы, што выяўляецца з дапамогай сістэмы метадаў, што рэалізуюцца, у сваю чаргу, праз традыцыйныя сродкі.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Республиканская программа «Молодежь Беларуси» на 2006–2010 годы*** // http://www.brsm.by/ru/youth_infoline/zakon/289698246/molodej
2. ***Об общем среднем образовании*** // http://www.pravo.by/webnpa/result.asp
3. ***Об образовании*** // http://www.pravo.by/webnpa/text.asp?RN=V19101202
4. ***Волков, Г.Н.*** Этнопедагогическое осмысление общечеловеческих ценностей / Г.Н. Волков // Мир образования – образование в мире. – 2003. – № 1. – С. 3–16.
5. ***Proverbia et dicta:*** шасцімоўны слоўнік прыказак, прымавак і крылатых слоў / Н.А. Ганчарова [і інш.]; пад рэд. Н.А. Ганчаровай. – Мінск: Універсытэцкае, 1993. – 246 с.
6. ***Арлова, Г.П.*** Беларуская народная педагогіка / Г.П. Арлова. – Мінск: Народная асвета, 1993. – С. 21.
7. ***Крук, І.І.*** Следам за сонцам: беларускі народны каляндар: дапам. для педагогаў дзіцячых дашк. устаноў / І.І. Крук. – Мінск: Ураджай, 1998. – С. 84.



*S U M M A R Y*

*The article deals with the theoretical foundations of traditions in aesthetic education in Belarusian people's pedagogy (of late 19th – early 20th centuries). It focuses on the substance of aesthetic education traditions in popular pedagogy, on the content of aesthetic education in Belarusian people's pedagogy.*



*Поступила в редакцию 1.03.2010*



Репозиторий ВГУ